# ШМАТГАЛОССЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНА-ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ

**Грамовіч І.М.**

*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускай народнапесеннай творчасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Шматгалоссе ў беларускай народна-песеннай традыцыі – з’ява не да канца даследаваная. Беларускія навукоўцы, збіраючы фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, пастаянна выяўляюць нешта новае ў гэтай вобласці. Па гэтаму ніводнае даследванне не можа прэтэндаваць на паўнату і канчатковую завершанасць.

Вядомы збіральнік і даследчык беларускага песеннага фальклора Г.І. Цітовіч адзначаў, што першапачаткова спевы на Беларусі былі аднагалосыя. Унісонная фактура народнай песні стварыла падставу для нараджэння шматгалосся. Выяўляючы стылявыя своеасаблівасці народнай песні, ён пісаў, што з выпадковых адхіленняў асобных галасоў ад асноўнага напеву ствараліся міжвольныя гетэрафонныя спалучэнні, ці так званыя “спевы з пералівамі” [4]. Гетэрафанія сустракаецца ў традыцыі паўднёвай, усходняй і цэнтральнай зонах Беларусі. У аснове сваёй гэта аднагалосыя спевы з эпізадычным адхіленнем ад унісону.

Больш пазнейшыя ўзоры напеваў маюць развітую і арнаментаваную мелодыю. Са з’яўленнем шматгалосся ўзнікае “працяглае рашчапленне меладычнай лініі голасу на тэрцыю, кварту і квінту [2, с. 85]. Гетэрафонны стыль уласцівы многім неабрадавым лірычным песням.

Песенная традыцыя Паазер’я ў аснове сваёй манадыйная. Большасць каляндарных песень поўначы спяваецца ва ўнісон. А вось для напеваў сямейнага і гадавога цыклаў характэрна антыфанія-папераменнае гучанне адной мелодыі.

На тэрыторыі Беларусі таксама сустракаецца дыяфанічны стыль (у перакладзе з грэчаскага – разнагучча) [1, с. 173]. Г.І. Цітовіч вызначаў гэты стыль як новы. Узнікшы са спеваў у суправаджэнні дуды ці ліры з іх бурдоннымі гукамі [4]. Некалькі бурдонных напеваў былі запісаны У.І. Раговічам на Віцебшчыне ад групы жанчын : купальскія “Як на Йвана, дужа рана”, ”Пойдзем, дзеўкі каля саду”, ”У цёмным лесе гаманіна”. Для гэтага стылю характэрна спяванне дзвюма, ці больш групамі галасоў бясконцага канона з элементамі бурдону. Інакш кажучы, дыяфанія гэта ўзор народнай поліфаніі, заснаванай на прынцыпе імітацыі ва ўнісон.

У другой палове XIX стагоддзя на паўднёвым усходзе і на поўдні Беларусі ўзнік найбольш вядомы тып шматгалосся “спевы з падводкай” Асноўная мелодыя праходзіць у басуючых галасоў, і толькі адна, ці некалькі спявачак “цягнуць падводку”. Саліруючы высокі голас супрацьстаіць асноўнай мелодыі. Шматлікія каляндарна-абрадавыя песні Гомельшчыны і Брэстчыны выконваюцца менавіта ў гэтым стылі. Л.С. Мухарынская лічыла, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менавіта ў паўднёвым рэгіёне беларуская гетэрафанія найбольш традыцыйная і сталая ў мастацкіх адносінах, тады як той жа стыль на поўначы не мае актыўнага развіцця [3, с. 158]. У сумесных спевах расчапленне галасоў адбываецца як у сярэдзіне, так і ў канцы меладычнай фразы. У бяседных і вясельных песнях сустракаецца актыўнае падваенне жаночых галасоў мужчынскімі, што вядзе да ўзнікнення двух, трохгалосся з падводкай. На Магілёўшчыне існуе прыём, калі адзін голас перадае асноўны напеў, а другі спяваецца ў самым простым варыянце.

Дзякуючы элементам імправізацыі, паміж галасамі з’явілася новая мелодыя са своеасаблівымі гарманічнымі сугуччамі. У фальклорна-этнаграфічных гуртах, дзе выканаўцы знаёмыя з падзелам галасоў на дзве рэгістравыя групы, зусім проста пераходзяць ад гетэрафаніі і пераліваў да расчаплення галасоў у актаву ў канцы песеннай страфы. Літаральна адбываецца паступовая перабудова аднагалосай мелодыі ў шматгалосую “з пераліваімі”, ці “з падводкай”. Падводка ладзіцца над асноўным напевам (звычайна на квінту) і выконваецца адной спевачкай. Гэта павінна быць спявачка з гучным голасам, які стварае рэгістравы кантраст і здольны выдзеліцца з агульнай масы галасоў. Ад таленавітасці “падводчыка” залежыць ступень арнаментаванасці і распетасці верхняга голасу.

Л.С. Мухарынская прыводзіць, на наш погляд, вельмі цікавы прыклад выканання адной і той жа песні выканаўцамі розных узроставых груп у розных песенных традыцыях у Касцюковіцкім раёне. “Спевакі сталага ўзросту выконвалі напеў вельмі мякка, на лёгкім дыханні, з дастаткова дакладным падзелаі галасоў, але з абавязковым вяртаннем у ніжнюю тоніку (да ўнісону) у канцы страфы. Маладыя дзяўчаты спявалі паўнагучна, з яскравай атакай кожнага высокага гуку і, як прыкмета стылю, з абавязковым разыходжаннем галасоў у кадэнцыі на актаву. Гэта яўная традыцыя падводкі, партыю якой выконвала адна спявачка” [3, с. 164]. Устойлівая аднагалосая традыцыя старэйшых працягвае сваё развіццё ў спяванні маладога пакалення з адначасовым імкненнем да наватарства, што дазваляе ўзбагаціць і пашырыць песенную традыцыю.

Існуе некалькі класіфікацый беларускага народнага шматгалосся. Адна з іх выдзяляе пяць яго асноўных відаў:

1. Гетэрафанія: нерэгулярнае расчапленне ўнісона (тыпова для абрадавых і працоўных песень); актаўнае расчапленне ўнісона (“фальцэтная падводка”); бурдон (тыпічны для Латвіі і Віцебшчыны); дыяфанія-сумяшчэнне бурдона і антыфонных спеваў (распаўсюджана на Віцебшчыне); асэнсаваная, рэгулярная гетэрафанія (спевы “з пераліваімі”); развітая гетэрафанія.
2. Падгалосачна-поліфанічнае шматгалоссе.
3. Гамафонна-гарманійнае шматгалоссе, якое склалася пад уплывам заходне-еўрапейскай прафесійнай музыкі, а таксама кантавых культур: трохгалоссе канта-штампа; тэрцовае кантавае дзвухгалоссе;пераменнае шматгалоссе ад унісону да дзвух, трох ці чатырох галасоў на розных частках напеву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Утора (дзве разнавіднасці ніжняя і верхняя ўтора): секундавая (літоўскія народныя песні); квартовая і квінтовая; тэрцовая.

5. Змешанае шматгалоссе. Уключае ў сябе ўсе пералічаныя элементы шматгалосся. Сюды можна аднесці і пераходныя віды шматгалосся.

У дастатковай ступені даследаваны гетэрафанія, утора і падводка. Традыцыя гетэрафонных спеваў найбольш старажытная і найбольш вялікая як па сваёй тэрыторыі, так і па сваёй разнастайнасці. Як бачна з класіфікацыі, налічваецца шэсць разнастайнасцей гетэрафаніі з рознай ступенню поліфанійнай інтэнсіўнасці фактуры. Гэта адрозненне адчыняе перад намі малюнак гістарычнай эвалюцыі гетэрафаніі, спачатку адхіленне ад унісону былі выпадковымі, потым яны сталі асэнсоўвацца народнымі спевакамі і нарэшце рэшт, гетэрафанія стала развітай.

Эпізадычныя расчапленні ўнісону ў гетэрафаніі ўзнікалі дзякуючы неасэнсаванаму вар'іраванню напева рознымі ўдзельнікамі фальклорнага гурта. Носьбіты традыцый называюць такі від шматгалосся-спевы “на адзін голас”. У самой справе: узнікаючыя ў такой фактуры выпадковыя вертыкальныя сугуччы не з'яўляюцца вызначаючымі, галасы зноў імкнкуцца зліцца ва ўнісон. Менавіта да гэтай разнавіднасці гетэрафаніі як нельга лепш падыходзіць вызначэнне “унісонна-гетэрафонныя спевы”.

Дзве другія разнавіднасці гетэрафаніі-бурдон і дыяфанія (сумяшчэнне бурдона і антыфоннага-дзвуххорнага спявання). Бурданіруючым з'яўляецца заўсёды ніжні голас, выканаўцы якога скандыруюць тэкст песні на вытрыманым тоне. Адзначым дзве разнавіднасці бурдону. У першым ніжні голас не адхіляецца ад вытрыманага тону, пры гэтым могуць узнікаць жорсткія квартовыя і секундавыя сугуччы. У другой-бурданіруючы голас можа адхіляцца ад асноўнага ўстою дзеля дісаніруючых гукаў кансаніруючымі. Гэта апошняя разнавіднасць магла паслужыць асновай узнікнення тэрцовай ўторы.

З цягам часу эпізадычныя гетэрафонныя адхіленні ад унісону ўсё больш і больш асэнсоўваліся народнымі спевакамі. У выніку асэнсаванай стала таксама і тэндэнцыя імправізацыйнага вар'іравання напеву. Узнікла асэнсаваная, рэгулярная гетэрафанія. Калі ў ранніх відах шматгалосся адхіленні ад унісону ў кожнай страфе ўзнікалі ў розных месцах, тады як пазней намецілася тэндэнцыя паўторнасці гэтых адхіленняў ва ўсіх строфах. Гэта асэнсаванасць у сваю чаргу зрабіла ўплыў на інтэнсіўнасць расчаплення ўнісону, якое сталі больш працяглымі. У далейшым гэтыя тэндэнцыі прывялі да паўлення развітай гетэрафаніі, якая як бы імкнецца перарадзіцца ў падгалосачную поліфанію.

Што тычыцца вертыкальнага ці гарманічнага аспекта гетэрафаніі, то для беларускай народнай песні характэрна, у асноўным, дзвухгалосыя сугуччы; трохгалосыя сустракаюцца не так часта, і яшчэ менш чатырохгалосыя. Інтэрвальны аспект гэтых сугуччаў залежыць ад лада выканваемага напеву. Найбольш старадаўнія напевы з вузкааб'ёмнымі ладамі, даюць па вертыкалі інтэрвалы секунды і тэрцы, рэдка-кварты, больш позднія, з аб'ёмнымі ладамі, адпаведна пашыраюць інтэрвальны дыяпазон сугуччаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вельмі цікавыя назіранні наконт узнікнення сугуччаў у гетэрафаніі мы знаходзім у Н.А. Гарбузава. Ён даследуе гэтыя сугуччы з чыста акустычнага пункту гледжання і прыходзіць да высновы, што яны ўзніклі пад уплывам мелодыка-гарманічных вобразаў інтэрвалаў, якія ўзнікаюць у свядомасці выканаўцаў пры спалучэнні спявання ў дадзены момант тона і рэшткаў гучання ад папярэдніх тонаў мелодыі. Сярод гэтых вобразаў найбольш яскравай з'яўляецца мелодыка-гарманічная тэрцыя, менш яркія-кварта, квінта і іншыя інтэрвалы. Секунда, па думцы Н.А. Гарбузава, утвараецца меладычным шляхам пры адхіленні аднаго з галасоў ад апорнага тона, які гучыць у другім голасе.

Пералічым далей розныя віды гетэрафонных расчапленняў унісону, большасць з каторых дзвухгалосыя. Прасцейшы-адхіленне ад унісону на адну рытмічную адзінку. Сярод іх сустракаюцца:

-унутрыслогавыя і міжслогавыя манарытмічныя адхіленні, калі напеў вар'іруецца толькі інтанацыйна;

-поліирытмічныя адхіленні, калі адзін голас цягне апорны гук, а другі адслаіваецца ад яго ці, наадварот, зліваецца з ім.

Больш складаныя віды расчапленняў на некалькі рытмічных адзінак наступныя:

-унутры і міжслогавыя, змешаныя, манарытмічныя расчапленні ў алднародны і разнародны інтэрвал (часцей за ўсё ў тэрцыю, кварту, квінту, часам ў сякунду ці актаву);

-адзін голас цягне апорны гук, а другі яго арнаментальна апявае;

-ободва галасы выконваюць розныя рытмічныя варыянты адной і той жа ўнутрыслогавай інтанацыі;

-галасы вядуць і рытмічны і інтанацыйны варыянты адной папеўкі.

Больш складаныя віды расчапленняў утвараюцца ў выніку гарызантальных, вертыкальных ці разам узятых элементарных відаў. Сярод іх сустракаюцца акрамя дзвухгалосых, таксама трохгалосыя, менш чатырохгалосыя.

Вельмі цікавым прадстаўляецца даследванне З.Я. Эвальд народна-песеннага шматгалосся ў пазаабрадавай лірычнай песне Беларускага Палесся [6, с. 38]. Для традыцыі гэтага рэгіёна характэрна ўнісонна-гетэрафоннае і двухгалосае сумеснае спяванне з характэрнымі квінтовымі сугуччамі, найбольш тыпічнымі для ўступа верхнега голасу, а таксама чаргаваннем сугуччаў квінты, кварты, тэрцыі і актавы па прынцыпу "нота супраць ноты". У ніжнім голасе, які выконвае хор, гучыць эпізадычна разгалінаваная асноўная мелодыя. Верхні голас кантрапунктуе асноўнай мелодыі і выконваецца адным спеваком.

Унісонна-гетэрафонная форма сумеснага спявання найбольш характэрна для спевакоў сярэдняга і сталага ўзросту, пераважна для жаночых гуртоў. Шматгалосая форма тыпічна для моладзі. Некаторыя песні выконваюцца сталымі жанчынамі ва ўнісон, з невялікімі гетэрафоннымі адхіленнямі. Тым часам моладзь гэтыя песні спявае шматгалоса. Гэта сведчыць аб тым, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шматгалосая форма сумеснага спявання сфарміравалася на Палессі ў больш позні час.

1. *Диафония* // Музыкальный энциклопедический словарь. – М., 1990. – С. 173.
2. *Можейко, З.Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 248 с.
3. *Мухаринская, Л.С.* Белорусская народная песня: История развития: Очерки / Л.С. Мухаринская. – Минск : Наука и техника, 1977. – 216 с.
4. *Цитович, Г.И.* Новые стилевы черты традиционной белорусской народной песни // VII Междунар. конгресс антропол. і этнограф. наук, авг. 1964 г., г. Москва / Г.И. Цитович. – М. : Наука, 1964. – 17 с.
5. *Цітовіч, Г.І.* О белорусском песенном фольклоре / Г.І. Цітовіч. – Мінск : Беларусь, 1976. – 135 с.
6. *Эвальд, З.Я.* Песні Белорусского Полесья / З.Я. Эвальд. – М. : Сов. композитор, 1979. – 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ